***Юлія Кучвальская***

## ГАЛАШЭННІ Ў НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ: ТРАДЫЦЫЯ, ІМПРАВІЗАЦЫЯ, НАВАЦЫІ

Галашэнні – адзін з старажытных паэтычных жанраў, адносіцца, перш за ўсе, да абрадавага фальклору. Галашэнні існуюць у сувязі з існаваннем самога абраду і функцыянуюць як водгук на экстрэмальную сітуацыю [10, с. 88]. Даследчыкі зафіксавалі існаванне галашэнняў у многіх народаў. Ёсць меркаванне, што яны бытавалі яшчэ задоўга да XI ст. Першыя звесткі аб галашэннях знойдзены ў далёкім мінулым у найстаражытнейшых помніках пісьменнасці – у старажытнаегіпецкіх папірусах, у помніках старажытнагабрэйскай літаратуры, у старажытнаіндыйскай «Махабхараце», у «Іліядзе», у грэчаскіх трагікаў, у рымскіх паэтаў Катула і Вяргілія, у ісландскіх сагах і інш. Гэтыя дадзеныя сведчаць аб неабходнасці і важнасці галашэнняў у жыцці кожнага народа, а таксама аб традыцыйнасці жанру.

У Еўропе памерлага аплаквалі французы, немцы, чэхі, грэкі, рымляне, балгары, літоўцы [1, с. 7]. Галашэнні як пахавальныя, так і вясельныя, атрымалі самае шырокае распаўсюджванне ў паўночна-усходняй Расіі. Арэал бытавання гэтага жанру ўключаў паўночную этнаграфічную зону рассялення рускіх і вялікую частку тэрыторыі фінамоўных народаў [12, с. 189-190]. Пахавальныя галашэнні яшчэ ў другой палове XIX – на пачатку XX стагоддзяў былі зафіксаваны фалькларыстамі па ўсёй тэрыторыі Беларусі [3, с. 61]. Вясельныя галашэнні ў беларусаў характэрны толькі для паўночна-усходніх раёнаў і паўднёвай зоны Паазер’я [4, с. 17]. На Балканах вясельныя галашэнні адсутнічаюць, аднак у іх вельмі развіта традыцыя пахавальных галашэнняў [12, с. 192-193]. Даследчыкі лічаць, што «пахавальная лірыка ўяўляе сабой адзін з тых відаў славеснай мастацкай творчасці, існаванне якіх несумненна засведчана на працягу ўсёй чалавечай гісторыі» [1, с. 6].

У.М. Сысоў падзяляе беларускую пахавальную абраднасць на восем паслядоўных частак, пры гэтым вылучае сем цыклаў галашэнняў, якія адносяцца да іх: 1) смерць чалавека, у галашэннях прысутнічаюць матывы аб канстатацыі смерці, уяўленні аб замагільным свеце; 2) на другім этапе ў галашэннях дамінуе матыў хуткага растання, апісанне труны як «хаты», «хаткі», «сялібачкі» і яе параўнанне з «цямніцай»; 3) наведванне памерлага, у галашэннях прысутнічаюць матывы апісання жыцця памерлага, яго лепшых якасцей і працоўнай дзейнасці; 4) вынас труны з нябожчыкам з хаты суправаждаецца галашэннямі з матывам ад’езду памерлага ў доўгую дарогу; 5) на гэтым этапе ў галашэннях распавядаюць аб апошняй дарозе нябожчыка на зямлі; 6) на этапе пахавання – апошняе развітанне з памерлым; 7) у час памінальнага стала галашэнні ўключаюць перажыванні аб страце, успаміны аб памерлым і выраз індывідуальных пачуццяў да яго [10, с. 13-84].

У тэкстах галашэнняў арганічна пераплятаюцца традыцыйнасць і імправізацыйнасць: тэкст утвараецца пры дапамозе традыцыйных паэтычных прыёмаў і ў пэўнай сітуацыі, у якой выконваюцца галашэнні [5, с. 105]. Як адзначае рускі фалькларыст К.В. Чыстоў, менавіта гэтыя традыцыйныя прыёмы ці «агульныя месцы», пры выкананні правіл іх выкарыстання, забяспечваюць функцыянаванне традыцыі [12, с. 189]. У пахавальных галашэннях, у першую чаргу, традыцыя ўплывае на тэкст, на яго стварэнне і выкананне [7, с. 269]. Такім чынам фарміруецца паэтычная структура галашэнняў пры дапамозе «стэрэатыпных формул і агульных месцаў, клішыраванных блокаў матываў, стабільных кампазіцыйна-тэматычных схем, стандартных паэтычных вобразаў» [8]. Так як вербальная частка галашэнняў «сітуатыўна і імправізацыйна» [12, с. 189], тэксты, пры стварэнні якіх актыўна выкарыстоўвалі традыцыйныя паэтычныя прыёмы, «функцыянавалі як разавыя тэксты, не падвяргаліся вар’іраванню» [ 11, с. 286].

Згодна з думкай П.Р. Багатырова, «асабліва ярка праяўляецца цесная сувязь абавязковага прытрымлівання нормаў традыцыі з ярка выяўленым імправізацыйным пачаткам у тых відах народнага мастацтва, у якіх стварэнне твора арганічна злучана з выканальніцтвам» [2, с. 394].

Умовы правядзення сучаснага пахавання не прадугледжваюць галашэнняў прафесійнай плакальшчыцы, вельмі рэдка дзе можна сустрэць выкананне дадзенага жанру плакальшчыцай. Але ў наш час была зафіксавана новая з’ява – гэта звычай калектыўнага галашэння альбо калектыўныя імправізацыі.

Прыклад калектыўнага галашэння зафіксаваны ў в. Тонеж Лельчыцкага раёна. Падставай да ўзнікнення звычаю стала жудасная падзея ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі атрадам эсэсаўцаў было расстраляна 260 мірных людзей, якія толькі хацелі, прыйшоўшы ў вёску, адпачыць, абагрэцца і ўзяць неабходныя рэчы ў лес. Пасля расстрэлу была спалена ўся веска, не засталося ніводнай хаты. Сярод загінуўшых выратавалася толькі адна жанчына, якая змагла вярнуцца да сваіх у лес – гэту жанчыну звалі Таццяна Бароўская. Зараз на гэтым месцы стаіць помнік загінуўшым аднавяскоўцам. Пасля вайны каля яго жанчыны галасілі кожны дзень, сёння калектыўнае галашэнне можна пачуць адзін раз у год – у першы дзень Вялікадня [9, с. 61-65].

З.Я. Мажэйка прыводзіць яшчэ адзін прыклад калектыўнай імправізацыі – гэта галашэнні-прычытанні «на бяду». Дадзеныя калектыўныя галашэнні, якія былі зафіксаваны на Гомельшчыне і Магілёўшчыне, з’явіліся пасля чарнобыльскай катастрофы. Сама З.Я. Мажэйка кажа пра дзве «крызісныя сітуацыі», якія паспрыялі ўзнікненню галашэнняў, звязаныя з «бязгучна змярцвелай прыроднай фонасферай» і «бязлюдным апустыньваннем роднай мясцовасці (малой Радзімы)» [6, с. 329-330].

З’яўленне калектыўных галашэнняў, безумоўна, абумоўлена ўсеагульнай трагедыяй. Дадзены жанр аб’ядноўвае чалавечае гора нацыянальнага маштабу, якое не забываецца і праз 30 гадоў, і праз 50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыя галашэння сфарміравалася як культурны феномен на скрыжаванні побытавай, рытуальна-абрадавай сферы чалавека і мастацтва менавіта ў сувязі з імправізацыйнай яе часткай, якая наканавана сітуатыўным кантэкстам, асаблівай эмацыйнай атмасферай.

У галашэннях устойлівая частка традыцыі заставалася вызначальнай, тады як варыятыўнасць сітуацый і асаблівасці прыватных якасцей выканаўцаў плачаў, іх вопыт, мастацкае майстэрства, творчае ўвасабленне плачу з улікам разумення імі канкрэтнай сітуацыі мелі сваёй перадумовай імправізацыю і ўплывалі на яе пэўным чынам.

**Спіс літаратуры:**


1. Андреев, Н. П. Русские плачи / Н. П. Андреев, Г. С. Виноградов // Русские плачи : (причитания) / ред. текстов и прим. Г. С. Виноградова. – Л. ; М., 1937. – С. VI–XXXVI.
2. Богатырев, П. Г. Традиция и импровизация в народном творчестве / П. Г. Богатырев // Вопросы теории народного искусства / П. Г. Богатырев. – М. : Искусство, 1971. – С. 393–401.
3. Варфаламеева, Т. Б. Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння / Т. Б. Варфаламеева // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / гал. рэд. А. С. Фядосік і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – С. 60–96.
4. Варфоломеева, Т. Б. Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы / Т. Б. Варфоломеева. – Минск : Наука и техника, 1988. – 156 с.
5. Кузнецова, В. П. Причитания / В. П. Кузнецова // Народные знания. Фольклор. Народное искусство / отв. ред. Б. Путилов, Г. Штробах. – М. : Наука, 1991. – С. 105–106.
6. Мажэйка, З. Я. Аўтэнтычны песенны фальклор і постфальклор у святле сацыяльна-экалагічных праблем усходнеславянскай нематэрыяльнай культуры / З. Я. Мажэйка // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XV Міжнар. з’езд славістаў, Мінск, 20-27 жн. 2013 г. : даклады беларускай дэлегацыі / рэдкал. : А. А. Лукашанец (адказ. рэд.) і інш. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 321–332.
7. Микитенко, О. О. Жанровые универсалии тужбалиц в контексте славянской плачевой традиции / О. О. Микитенко // Этнопоэтика и традиция : к 70-летию чл.-корр. РАН В. М. Гацака / отв. ред. В. А. Бахтина ; Ин-т мировой литературы им. А. М. Горького. – М. : Наука, 2004. – С. 261–270.
8. Микитенко, О. О. Традиция и импровизация в тужбалицах / О. О. Микитенко // Рябининские чтения – 1999 [Электронный ресурс]. – 2000. – Режим доступа : http://kizhi.karelia.ru/library/ryabinin-1999/203.html. – Дата доступа : 11.03.2014.
9. Можейко, З. Я. Песенная культура Белорусского Полесья: Село Тонеж / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1971. – 261 с.
10. Сысоў, У. М. Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння / У. М. Сысоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.
11. Чистов, К. В. Причитания / К. В. Чистов // Восточнославянский фольклор : словарь научной и народной терминологии / ред. кол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 285–287.
12. Чистов, К. В. Причитания у славянских и финно-угорских народов / К. В. Чистов // Фольклор. Текст. Традиция / К. В. Чистов. – М. : ОГИ, 2005. – С. 186–198.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ